This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2022.pp.83-95

Przegląd Środkowo-Wschodni, 7, 2022
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20220704

Data przesłania: 27.06.2022
Data akceptacji: 24.07.2022

Ніна Стужынская
Instytut Slawistyki Polskiej Akademii Nauk
belwliga@gmail.com
ORCID: 0000-0002-6184-1650

Касцёл і антысавецкі рух у Беларусі ў 1920-я гг.

Kościół a ruch antysowiecki na Białorusi w dwudziestych latach XX wieku

Artykuł traktuje o mało dotąd znanych epizodach udziału duchowieństwa katolickiego w ruchu antybolszewickim na Białorusi. Na podstawie akt śledczych przeciwko przedstawicielom duchowieństwa katolickiego na przełomie lat 20. i 30 XX w. Autorka ukazuje udział księży w Mińsku i innych miastach w stawianiu oporu władzom sowieckim i ich polityce antyreligijnej, w tym akcji konfiskacji mienia kościelnego przeprowadzanej pod pozorem walki z głodem w Rosji.

Słowa kluczowe: duchowieństwo, kościół, powstanie, rabunek, więzienie

У гісторыі антысавецкага супраціву ў Беларусі прадстаўнікі духавенства пакінулі заўважальны след. Варта ўзгадаць лідарства кс. М. Буклярэвіча падчас паўстання ў Дзісненскім і Дзвінскім паветах у 1919 г. Святар і яго сястра загінулі падчас карнай аперацыі Чырвонай арміі. *"Zamordowani za miłość do ludzi i Ojczyzny"* – сведчыць надпіс на магіле кс. Буклярэвіча і яго сястры Аліцыі на падворку Іказненскага касцёла[1]. На жаль, па прычыне недахопу крыніц малавядомай застаецца буйная паўстанцкая акцыя на Ігуменшчыне ў ка-

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), ф.4п, воп. 1, сп. 74, арк. 7адв.

стрычніку – лістападзе 1920 г., якую ўзначальваў кс. Варановіч. Верагодна, што ўзброенае выступленне ў Пагарэльскай, Якшыцкай, Белічанскай і іншых валасцях павета з заклікамі да незалежнасці Беларусі і вітаннямі Беларускай Рады як паўнамоцнай улады, было адным са злучвоў у ланцугу тагачасных антысавецкіх узброеных выступленняў. Цікава, што дадзеныя падзеі адбыліся за месяц да таго, як пачаўся знакаміты Слуцкі збройны чын. У выніку вайсковай карнай аперацыі супраць паўстанцаў было затрымана 560 чалавек, расстраляна 56, разбурана некалькі штабоў, а ў палон трапіла 150 партызан. Колькасць ахвяр, як і задзейнічанне рэгулярных частак Чырвонай арміі на чале з вядомым карнікам Якавам Кутафіным, сведчаць аб маштабах і пэўнай ступені арганізаванасці ўзброенага выступу на Ігуменшчыне[2].

Паўстанні 1919–1920 гг., якія не дасягнулі сваёй мэты па змене ўлады, перафарматаваліся ў партызанскі рух. Са скарачэннем магчымасці вядзення ўзброенай барацьбы з-за маштабных карных аперацый супраціў сышоў у падполле. На месцах актыўна ішоў працэс арганізацыі мясцовых антысавецкіх камітэтаў, баявых груп, агентурных сетак, кіруючыя цэнтры якіх у большасці знаходзіліся за мяжой, якая ўзнікла пасля Рыжскага пагаднення 1921 г.

У новай палітычнай рэчаіснасці касцёлы станавіліся асяродкамі самаарганізацыі грамадства як духоўныя апірышчы для вернікаў у небяспечны і непрадказальны час. Рэлігійны фактар моцна матываваў людзей да аб'яднання і ўзмацнення антысавецкай актыўнасці. Пагроза ў бок касцёла ўспрымалася вернікамі як асабістая небяспека. Тым часам новая ўлада ў каталіцкіх установах бачыла моцную небяспеку для свайго панавання. Ужо 1 ліпеня 1920 г. па ўсім губернскім ЧК быў разасланы цыркуляр за подпісам Фелікса Дзяржынскага, у якім адзначалася, што "*ксяндзы ў справе арганізацыі шпіянажу і змоў адыгрываюць буйную ролю. Неабходна іх*

[2] Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ), ф.40п, воп.1, сп.64, арк.1.; ф. 40п, воп. 1, сп. 7, арк. 27; "Звезда" 1920, 9, 18 декабря.

абясшкодзіць”[3]. Старшыня ВЧК разаслаў распараджэнні, “*каб усе ксяндзы былі ўзяты на ўлік і пад нагляд*”. З мэтаю “*ўлучэння ў ксяндзоўскую канспірацыю*” цыркуляр патрабаваў стварэння адмысловых, пераважна жаночых, груп для шпіянажа за святарамі. Чэкісты лічылі, што менавіта ў спавядальні святары атрымліваюць каштоўнаю інфармацыю, а ў храме “фанатызуюць” каталікоў. Губернскім аддзелам ЧК сумесна з Асобымі аддзеламі Чырвонай арміі Ф.Дзяржынскі загадваў арганізаваць сачэнне за святарамі[4]. Архіўна-следчыя справы ксяндзоў 1930-х гг. сведчаць, што такая практыка шырока выкарыстоўвалася.

Трывалыя асяродкі супраціву новай уладзе ўзнікалі ў вёсках і мястэчках, дзе каталіцкае насельніцтва складала да 60%, як, напрыклад, у згаданых мясцінах на Ігуменшчыне. Жыхар вёскі Зафранцузская Грэбля[5] Ісаак Герман у 1929 г. сведчыў, што жыхары Болачскага, Суцінскага, Грабянецкага, Лапічскага сельскіх саветаў, дзе большасць насельніцтва складала шляхта (у тым ліку праваслаўнага веравызнання), стварылі пасля кастрычніцкай рэвалюцыі “асяродак бандытызму”[6]. Насуперак уладам у вёсках існавалі польскія школы, заснавальнікамі якіх былі каталіцкія святары. У кастрычніку 1922 г. кс. Ян Маціеўскі, які служыў у вёсцы Зарэчча (Блонь), трапіў у АДПУ “*за незаконнае адкрыццё рэлігійнай школы*”[7]. Праз сем год святар абвінавачваўся “*ў садзейнічанні бандытызму і пасылцы моладзі ў Польшчу вучыцца на ксяндзоў”*. Духоўнік быў заўважаны ў сувязях з мясцовымі паўстанцамі, якія рыхтавалі захоп улады ў Ігумене ў жніўні 1921 г. Акрамя таго, яго

---

[3] *Ф.Э. Дзержинский – председатель ВЧК-ОГПУ. 1917–1926. Россия XX век,* Документы. Сост. А.А. Плеханов, А.М. Плеханов. Международный фонд «демократия», М 2007, с. 197.

[4] Тамсама.

[5] У 1921 г. гэта вёска амаль цалкам была выселена на поўнач Расіі.

[6] Цэнтральны архіў Камітэта Дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (ЦА КДБ), Архіўна-следчая справа №31800, у 2-х тамах, том 1, с. 322.

[7] ДАМВ, ф. 458, воп.1, сп.5058, Справа Цэнтральнага ДОПРа (Дом грамадскай прымусовай працы) Беларусі на заключенага Мацыеўскага Івана (Яна) Іванавіча.

абвінавачвалі ў распаўсюджанні агітацыйных улётак і дапамозе польскаму агенту Станіславу Мікошы. Трэба адзначыць, што спіс абвінавачванняў павялічыўся менавіта ў 1929 г., калі спецслужбы палічылі кс. Маціеўскага стваральнікам гуртка імя Юзафа Пілсудскага. Той факт, што актыўныя дзеячы супраціву 1921 г. (Віктар Замбржыцкі, Аўгустын Крукоўскі, Павел Старжынскі) вярнуліся на радзіму ў 1928 г., каб працягнуць барацьбу з савецкай уладай, можна разглядаць як праяву ўплыву кс. Маціеўскага[8]. У 1928 г. П. Старжынскі правёў нелегальныя сходы шляхты з мэтай арганізацыі антысавецкай партызанкі. Кастусь Быкоўскі з вёскі Усохі, які таксама вярнуўся з Польшчы для фармавання падполля, тлумачыў, што яны вярнуліся дамоў не таму што засумавалі па радзіме, а таму, што так патрабуюць інтарэсы Польшчы. Незадаволеныя сяляне ўсё часцей выказвалі сімпатыі ў бок Польшчы. Людзі чакалі вайны, паколькі лічылі яе збаўленнем ад пакут і савецкага прыгнёта.

У руху супраціву савецкай уладзе ўдзельнічаў таксама кс. Іосіф Пяткевіч. У Койданаве святар падтрымаў дзеянні паўстанцаў, якія ў лістападзе 1920 г. паспрабавалі стварыць самастойную "Койданаўскую рэспубліку". У 1922 і 1925 гг. кс. Пяткевіч трапляў пад арышт з прычыны "антысавецкай прапаганды" на Случчыне і ў ваколіцах Узды. Да крымінальнай справы святара чэкісты далучылі паказанні спрытнага польскага вывядоўцы Яна-Змітра Прухневіча, які ўсімі сродкамі пасля арышту спрабаваў патрапіць у спіс на абмен закладнікамі. Агент сварджаў, што яму аказваў садзейнічанне Іосіф Пяткевіч[9]. 27 лютага 1925 г. у Мінску адбыўся чарговы па-

[8] Маціеўскі Ян (Іван) Іванавіч, 1897 г. н., літовец, месца нараджэння: вёска Лаванішчы Антураўскай воласці Нова-Аляксандраўскай воласці Ковенскай губерні. На момант арышту пражываў у вёсцы Зарэчча Блонскага сельскага савета Пухавіцкага раёна. Другі раз арыштаваны 14 траўня 1929 г. 13 верасня 1929 г. святар расстраляны ў Мінску. Рэабілітаваны ў верасні 1991 г. ЦА КДБ, Архіўна-следчая справа № 31800, т. 1, с. 439

[9] Тамсама, сп. № 26931-с, с. 245. Пяткевіч Іосіф Станіслававіч, вядомы грамадскі і рэлігійны дзеяч, беларус, 1888 года нараджэння (па другім дадзеным -1892 г.), мястэчка Лепель Віцебскай губерні. У 1920-м годзе служыў у мястэчку

казальны працэс над польскімі "тэрарыстамі і шпіёнамі". Да смяротнага пакарання былі прагавораны ўдзельнікі групы Яна Камінскага (сапр. прозвішча Прухневіч – НС), якія здзейснілі напад на мястэчка Койданава ў кастрычніку 1924 г. Падчас гэтай справы кс. Пяткевіч абвінавачваўся ў дапамозе кіраўніку дыверсійнай групы[10].

Хвалю абурэння і нават стыхійныя выступленні каталіцкіх вернікаў выклікала кампанія па рэалізацыі дакрэта Усерасійскага цэнтральнага выканаўчага камітэта аб канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей (1922 г.). Кампанія пад выглядам збора сродкаў для барацьбы з голадам на самай справе мела на мэце дыскрэдытацыю і разбурэнне рэлігійных устаноў, арганізацыю масавых рэпрэсій супраць духавенства і актыўных вернікаў, атрыманне валютных сродкаў на патрэбу ўлад. У цэнтры руху супраціву гараджан супраць рабаўніцкіх дзеянняў улады апынуўся кс. Адам Лісоўскі, вядомы грамадскі і рэлігійны дзеяч XX стагоддзя. У 1918–1922 гг. ён служыў у прыходах Каралішчавічы і Аннаполь, а таксама займаў пасаду адміністратара кафедральнага касцёла ў Мінску (сёння архікафедральны касцёл Найсвяцэйшай Панны Марыі – НС). У 1922 г. святар узначаліў Мінскі дэканат. Шмат у якіх крыніцах узгадваецца, што на пачатку 1920-х гг. а. Адам абвінавачваўся савецкімі ўладамі ў контррэвалюцыйнай дзейнасці і быў арыштаваны органамі бяспекі. Аднак падрабязнасці падзей, якія ўскаланулі беларускую сталіцу, практычна невядомы. На гісторыю стогадовай даўніны, а менавіта выступленне прыхаджан супраць абрабавання храма, пралівае святло турэмная архіўная справа кс. Адама Лісоўскага і вернікаў, якія не пакінулі свайго пастыра ў цяжкую хвіліну выпрабавання. На вокладцы дакумента (турэмная справа выгладае як звычайны вучнёўскі сшытак) пазначана, што 27 траўня 1922 г. святар апынуўся ў камеры так званага ДОПРа (Дом грамадска-прымусовай працы,

Койданава, ў 1922–1923 гг. – у вёсцы Бабоўня Слуцкага павета (цяпер у Копыльскім раёне Мінскай вобласці). Падчас арышту 1933 г. – настаяцель храма ў Капылі. Расстраляны ў 1937 г. у г. Кемь.

[10] ДАМВ, ф. 458, воп. 1, сп. 6514.

сёння Мінская турма). Арышт адбыўся 2 траўня (памылкова ў некаторых публікацыях пазначаецца 31 траўня- НС). Хваляванні каля кафедральнага касцёла пачаліся менавіта 2 траўня падчас з'яўлення там спецыяльнай камісіі і першых спроб канфіскацыі. У той жа дзень адбыліся арышты[11].

Тое, што Адам Лісоўскі трапіў у Мінскую турму толькі напрыканцы траўня азначае, што больш за 20 дзён ён знаходзіўся ў падвалах беларускага ДПУ. Можна толькі здагадвацца, якія выпрабаванні тады пражыў святар. 18 ліпеня зняволены разам з іншымі святарамі па агульнай справе быў накіраваны ў ДПУ ў Маскву. Гучная справа разглядалася Вярхоўным рэвалюцыйным трыбуналам Беларусі на працягу 3-х дзён, з 29 па 31 траўня 1922 г. Тагачасныя суды з прысутнасцю абароны ў разглядаемы час былі выключэннем чым правілам, а публічныя працэсы дасягалі ў першую чаргу паказальных палітычных мэтаў. Трыбунал меў правакацыйны монанацыянальня характар. Смяротны прысуд выносілі палякі Мар'ян Стакоўскі, міністр аховы здароў'я БССР, партыйны функцыянер Адам Славінскі, які часцяком, як наракалі партыйныя кіраўнікі Беларусі, на публічных мерапрыемствах быў у нецвярозым стане і выступаў з бязглуздымі прамовамі[12]. На судзе прысутнічаў таксама чэкіст Ян Кепэ, будучы асабісты сакратар Ф. Дзяржынскага. Абвінаваўцамі выступілі вядомыя ва ўладнай ярархіі палякі Юльян Ляшчынскі (Ленскі) і Станіслаў Пясткоўскі. "Зорны" склад трыбуналу сабраўся не выпадкова: на лаве падсудных знаходзіўся не толькі адзін з найбольш уплывовых у каталіцкім асяроддзі святароў, але і грамадскі дзеяч. Улады намагаліся надаць працэсу як мага шырэйшы розгалас: быццам дзеянні святара правакавалі міжнародны канфлікт, парушалі артыкулы Рыжскай дамовы[13].

[11] ДАМВ, ф. 458, воп. 1, сп. 4520, Справа Цэнтральнага ДОПРа (Дом грамадскай прымусовай працы) Беларусі на заключенага Адама Іосіфавіча Лісоўскага.

[12] НАРБ, ф. 4п, воп. 1, сп. 659, арк. 342.

[13] ДАМВ, ф. 458, воп. 1, сп. 4520.

Разам з тым трэба адзначыць, што ўлада на той момант не апускалася да таго, каб ў якасці сведкаў выкарыстоўваць сваіх сакрэтных супрацоўнікаў, якія збіралі інфармацыю сярод вернікаў, уціраліся ў давер святароў. "Брудныя тэхналогіі" ўвайшлі ў практыку толькі ў 1930-я гг. У выніку кс. Лісоўскі быў прызнаны арганізатарам антысавецкіх акцый па ўсёй Беларусі, які "агітаваў сярод духавенства і прыхаджан". Святар быў абвінавачаны ў тым, што ён "*схаваў у сябе ключы ад кафедральнага сабора, адмовіўся іх выдаваць законным прадстаўнікам улады*". З абвінаваўчай часткі прысуду вынікае, што святар "*імкнуўся ствараць паміж уладай і масамі вострые канфліктные адносіны, давесці да сутыкнення*".[14] Акрамя таго святара абвінавацілі ў кантактах з польскай уладай і распальванні дыпламатычных скандалаў. Абвінаваўцы патрабавалі прысудзіць яго да вышэйшай меры пакарання. Нягледзячы на грубасткія шматслоўныя абвінавачванні трыбунал улічыў настроі ў грамадстве і вырашыў не даводзіць справы да грамадскага выбуху. Пасля вынясення расстрэльнага прысуда "суддзі" вельмі напружваліся ў пошуках абгрунтавання для змены вышэйшай меры пакарання на прымусовую працу ў канцлагеры. Варта цалкам прывесці цытату судовага заключэння:

> Аднак маючы на ўвазе, што падчас царскага кіравання Каталіцкая царква пераследвалася, а савецкая ўлада не паспела яшчэ давесці да фанатычных мас сапраўдныя адносіны савецкай улады да касцёла і спраў веры, якія заснаваны на талеранцыі і раўнапраўі, Лісоўскаму Адаму знізіць ступень пакарання да 5 год прымусовай працы[15].

Побач з кс. А. Лісоўскім на лаве падсудных апынуліся яшчэ два святара – кс. Міхал Тамашэўскі і кс. Ян Васілеўскі, якія ўзялі актыўны ўдзел у справе абароны маёмасці сабора. Пра апошняга вядома, што ён на пачатку 1920-х гг. служыў у Архангельску і Петраградзе, быў накіраваны ў Мінск на дапамогу святарам і вернікам,

[14] Тамсама.
[15] Тасама.

якія пратэставалі супраць канфіскацыі маёмасці касцёлаў. Як сведчыць прысуд:

> святара Васілеўскага, 37 год, паходжанем з вёскі Мудрылава Дзвінскага павету Віцебскай губерні прыгаварыць да 3 год прымусовай працы (...) Ён агітаваў сярод прыхажан за супраціў уладам, перашкаджаў складанню вопісаў (каштоўнасцей – НС), не прысутнічаў пры рэквізіцыі[16].

Прыкладна такі ж спіс абвінавачанняў быў прад'яўлены і кс. Тамашэўскаму, настаяцелю храма на Кальварыі (Мінск). Гэты святар, які меў 47 год і паходзіў з Вільні, быў асуджаны на 4 гады зняволення і прымусовай працы. Да таго ж трыбунал абвінаваціў святара ў тым, што ён даў прытулак гомельскаму святару кс. Леону Буйноўскаму, які "ўхіляўся ад следства і суда"[17].

Напярэдадні канфіскацыі маёмасці ў касцёл быў запрошаны фатограф Ізраіль Метар, каб сфатаграфаваць скарб храма. Суд палічыў, што ініцыятарам вырабу здымкаў "для агітацыйных мэтаў" быў кс. М. Тамашэўскі, які перадаў выявы касцельных каштоўнасцей польскім уладам. Айцец Міхаіл справядліва лічыў, што яны могуць быць страчаны назаўсёды. Пры тым святар пераконваў камісію, што касцёл не мае нічога, што магло б яе задаволіць. Удзельнік працэса І. Метар даў паказанні, што сапраўды быў запрошаны кс. Тамашэўскім "*ў кафедральны сабор для выканання здымкаў алтара і месцаў, адкуль будуць зняты каштоўнасці, ён сфатаграфаў іх і перадаў здымкі і клішэ кс. Тамашэўскаму, за што атрымаў 45 млн. рублёў*"[18].

Увесну 1922 г. вернікі Мінска і другіх беларускіх гарадоў актыўна выступілі супраць канфіскацыі маёмасці касцёлаў, выкарыстоўваючы розныя формы непадпарадкавання. На жаль, гісторыя гэтых народных хваляванняў мала прадстаўлена ў гістарычнай

[16] Тамсама.
[17] Тамсама.
[18] Тамсама.

прасторы па прычыне надахопу крыніц і слабай зацікаўленасці даследчыкаў. Мы валодаем толькі адзінкавымі прыкладамі, якія сведчаць аб удзеле вернікаў у абароне сваіх святынь. Супраціў аказвалі нават тыя, хто ўваходзіў у склад камісій па канфіскацыі касцельнай маёмасці. Напрыклад, Іваноўскі Міхась са Случчыны вымушаны быў пагадзіцца на ўдзел у камісіі ў якасці эксперта (ювеліра), але ён "*даваў ілжывыя паказанні адносна царкоўнага скарбу, прыняў удзел у непраўдзівым складанні вопісаў, адмовіўся памагаць пры канфіскацыі каштоўнасцей*". [19] Дашкевіч Станіслаў, якога ўлада ўнесла ў спіс афіцыйнай камісіі, увогуле адмовіўся прысутнічаць падчас ганебных дзеянняў ў касцёлах. Левандоўскі Стэфан, 52-гадовы слесар, які паходзіў з Варшаўскай губерні і яго аднагодак Асінскі Іосіф з Вільні, служачы канторы, як прадстаўнікі рэлігійнай супольнасці ў камісіі, павінны былі прапанаваць рэчы роўнага кошту для замены літургічных прадметаў. Як сведчыў судовы прысуд, яны нічога не зрабілі, а толькі "садзейнічалі канфлікту". Некаторыя члены "ад грамадства" пасіўна супраціўляліся працы камісіі, пакінуўшы горад на час працы органа. Тым часам малады жыхар Мінска Мілашэўскі Францыск, якога добра ведалі многія жыхары сталіцы, "*актыўна агітаваў сярод натоўпу супраць савецкай улады*"[20].

Тэрміны, на якія былі асуджаны абаронцы касцёла, былі невялікія – ад 6 месяцаў да 4 год, што ў разглядаемы перыяд з'яўлялася распаўсюджанай практыкай. З пункту гледжання ўлад важна было як мага больш людзей застрашыць турмой і прымусовай працай у канцэнтрацыйных лагерах. Прысуды тлумачыліся "неадукаванасцю і цемнатой контррэвалюцыянераў". Бачна, што ўвесь цяжар абвінавачанняў быў скіраваны на каталіцкае духавенства, а "*злачынствы былі здзейснены пад уплывам агітацыі духавенства"*[21].

[19] Тамасама.
[20] Тамсама.
[21] Тамсама, сп. 2426.

Даволі аб'ёмістая справа была заведзена на рызніка мінскага кафедральнага сабора Станіслава Дашкевіча. Вернік не пагадзіўся з прысудам, які палічыў несправядлівым, і спрабаваў звяртацца са скаргамі ў афіцыйныя савецкія ўстановы. Падчас знаходжання ў турме С. Дашкевіч падрыхтаваў скаргу на імя Аляксандра Чарвякова. За гэты ўчынак вернік чарговы раз быў абвінавачаны ў контррэвалюцыі, яму было адмоўлена ў амністыі і на 7 дзён кінуты ў карцар[22].

Заслугоўвае ўвагі яшчэ некалькі выпадкаў, якія адбыліся ў Беларусі падчас бальшавіцкай акцыі скіраванай супраць касцёлаў. У Віцебску ў касцёле Св. Антонія камісія па ўліку каштоўнасцей з'явілася 25 красавіка 1922 г. Па хадайніцтве гэтай камісіі быў арыштаваны кс. Стэфан Трускоўскі за адмову ўдзельнічаць у падліку рэчаў, якія падлягалі канфіскацыі. У выніку камісія адабрала 6 срэбных чаш, брыллянтавы нашыйнік, 3 залатыя пярсцёнкі і 238 дробных прадметаў. Амаль адначасова ахвярай згаданай камісіі стаў касцёл Св. Варвары. У траўні 1922 г. абвінаваўчы матарыял на кс. Трускоўскага паступіў у Рэвалюцыйны трыбунал. Святар быў асуджаны на 5 год турмы са строгай ізаляцыяй[23].

12 красавіка 1922 г. Гомельскі губернскі камітэт РКП (б) прыняў пастанову аб неабходнасці пачаць агітацыйную дзейнасць сярод польскага (каталіцкага) насельніцтва. Партыйны актыў збіраўся пераконваць гараджан у неабходнасці канфіскацыі літургічных прадметаў на карысць ахвяраў голада ў Паволжжы. У адказ ужо згаданы кс. Леон Буйноўскі звярнуўся да вернікаў каля касцёла на цэнтральнай плошчы Гомеля і заклікаў іх бараніць маёмасць святыні. Старшыню гарадскога выканаўчага камітэта Нейбаха, які схіляў натоўп да мірнай перадачы золата і другога храмавага скарбу, а таксама

[22] Тамсама.

[23] В.В. Горидовец, *Хроника изъятия ценностей из религиозных общин Витебской губернии в 1922 годе,* [on line], http://witebsk.orthodoxy.ru/i2/publ/003.html [доступ 21.02.2022]; Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 2289, воп. 2, спр. 87, арк. 76.

адказных камуністаў з губернскага камітэта, каталікі закідалі камянямі. Артадаксальныя яўрэі, якія далучаліся да сходу, прамовы ксяндза і вернікаў сустрэлі апладысментамі. Кс. Л. Буйноўскі быў папярэджаны аб арышце, але з'ехаў у Мінск, дзе хутка трапіў у ДПУ разам з іншымі святарамі[24]. У ліпені 1922 г. яны былі этапаваны ў Маскву, у Бутырку. У тыя часы бальшавікі пачалі выкарыстоўваць на поўніцу інстытут закладніцтва. Прэзідыюм ВЧК 17 снежня 1919 г. прыняў пастанову "аб арышце закладнікаў і буржуяў" з тлумачэннем, што належыць разумець пад словам закладнік. У дакументе адзначалася: "*Гэта палонны, член таго грамадства ці той арганізацыі, якая змагаецца з вамі. Пры гэтым такі арыштант, які мае нейкую каштоўнасць для працаўніка і які можа быць закладам таго, што за яго (...) не расстраляюць нашага таварыша*". Аўтары тлумачальнай запіскі дадавалі, што "*за нейкага вясковага настаўніка, ляснічага, дробнага чыноўніка, да таго ж яўрэя, працаўнік нічога не дасць*[25].

Чэкісты раілі браць у закладнікі памешчыкаў, навукоўцаў, людзей заўважальных і ўплывовых. У катэгорыю "каштоўных закладнікаў" трапілі таксама каталіцкія святары. У выніку абмену палітвязнямі ў верасні 1923 г. кс. Я. Васілеўскі выехаў ў Латвію, а святары А. Лісоўскі і М.Тамашэўскі ў 1924 г. - у Польшчу. Тым часам кс. Л. Буйноўскі таксама быў вернуты ў Польшчу ў выніку абмена. 25 красавіка 1924 г. 54 польскія закладнікі былі этапаваны з Бутыркі і Яраслаўскага палітычнага ізалятара ў Мінскі ДОПР. Спіс ксяндзоў для абмена ўзначальваў Іосіф Александровіч[26].

---

[24] *Католики Понизовья и Северщины*, [on line], https://poisk-ru.ru/s10527t8.html [доступ 21.02.2022]. Кс. Леон Буйноўскі нарадзіўся 16 чэрвеня 1891 г. У 1922 г. – настаяцель і дэкан у Гомелі. З 1939 г. служыў у прыходзе Нядзведзіца, заставаўся там падчас савецкай і нямецкай акупацыі. 27 чэрвеня 1942 г. а. Леон быў арыштаваны немцамі. 13 ліпеня 1943 г. разам з 14 святарамі расстраляны ў Баранавічах. ДАМВ, ф. 458, воп. 1, сп. 4520.

[25] *Ф.Э. Дзержинский – председатель ВЧК-ОГПУ. 1917–1926*…, с. 148.

[26] ДАМВ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, арк. 79.

Памеры голада як вынік Грамадзянскай вайны і авантурнай эканамічнай палітыкі бальшавікоў былі відавочны ўжо ўвосень 1921 г. Харчовых рэсурсаў савецкая краіна не мела, таму шляхам рабавання царквы бальшавіцкі рэжым спрабаваў часткова вырашыць праблему. Аднак не толькі гэтым належыць тлумачыць выбар касцёла як аб'екта для наступу і пакрокавага знішчэння. Гвалтоўны захоп улады, усталяванне дыктатуры выклікалі масавыя сялянскія хваляванні, арганізаваныя выступленні ўзброенай апазіцыі, у якіх узялі ўдзел прадстаўнікі духавенства. У сувязі з гэтым савецкая ўлада з самага пачатку вызначыла клір адным са сваіх асноўных палітычных ворагаў.

Bibliografia

Cèntral′ny arhìŭ Kamìtèta Dzâržaŭnaj bâspekì Rèspublikì Belarus′ [Цэнтральны архіў Камітэта Дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь].

Dzâržaŭny arhìŭ Mìnskaj voblascì [Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці], f.: 458.

F.È. Dzeržinskij – predsedatel' VČK-OGPU. 1917–1926. Rossiâ HH vek, Dokumenty, sost. A.A. Plehanov, Moskva 2007 [*Ф.Э. Дзержинский – председатель ВЧК-ОГПУ. 1917–1926. Россия XX век,* Документы, сост. А.А. Плеханов, А.М. Плеханов, Москва 2007].

Goridovec V.V., *Hronika iz"âtiâ cennostej iz religioznyh obŝin Vitebskoj gubernii v 1922 gode*, [Горидовец В.В.*Хроника изъятия ценностей из религиозных общин Витебской губернии в 1922 годе*], [on line], http://witebsk.orthodoxy.ru/i2/publ/003.html [dostęp 21.02.2022].

Katoliki Ponizov'â i Severŝiny [*Католики Понизовья и Северщины*], [on line], https://poisk-ru.ru/s10527t8.html [dostęp 21.02.2022].

Nacyânal′ny arhìŭ Rèspublikì Belarus′ [Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь], f. 4p.

The Church and the anti-Soviet movement in Belarus in the 1920s

The article deals with the so far little known episodes of the participation of the Catholic clergy in the anti-Bolshevik movement in Belarus. Based on investigative files against representatives of the Catholic clergy at the turn of the 1920s and 1930s, the author

shows the participation of priests in Minsk and other cities in resisting the Soviet authorities and their anti-religious policy, including the confiscation of church property under the guise of fighting hunger in Russia.

K e y w o r d s : clergy, church, uprising, robbery, prison